Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 26/12/2024 08:20:51

DOI:10.17951/sb.2022.16.115-131
Studia Białorutenistyczne 16/2022 LITERARY STUDIES
ISSN: 1898-0457 e-ISSN: 2449-8270 Licence: CC BY 4.0

Anatol Brusevich / Анатоль Брусевіч

Yanka Kupala State University of Grodno (Belarus)
e-mail: brusevich@tut.by
https://orcid.org/0000-0002-0007-5147

# Паэзія Адама Асныка ў кантэксце беларускай культурна-гістарычнай парадыгмы

*Poetry of Adam Asnyk in the Context of the Belarusian Cultural and Historical Paradigm*

*Poezja Adama Asnyka w kontekście białoruskiego paradygmatu kulturowo-historycznego*

**Abstract**

The purpose of the article is to study the artistic features of the lyrics of Adam Asnyk, analyse the ideological and aesthetic foundations of his creative method and poetic style, as well as scientific understanding of the place and role of this outstanding representative of Polish literature within the Belarusian cultural and historical paradigm. To achieve this goal, on the example of individual poems, the methods of artistic interpretation by the poet of a number of issues that worried both him and Polish society in the era of post-romanticism were shown. It should be noted that A. Asnyk was a native of the so-called „Russian" Poland – those regions that, after the partition of the Polish–Lithuanian Commonwealth, together with the lands of the Grand Duchy of Lithuania (Belarusian lands), became part of the Russian Empire. This fact becomes not only one of the main factors that influenced the formation of the creative consciousness of A. Asnyk himself, but also the key to explaining how and why his poetry found a response from Belarusian writers – Yanka Luchina, Yanka Kupala, Zoska Veras, Yanka Bryl. Also, the genuine interest of Belarusians in the Polish author is explained by common cultural and historical values and traditions, a similar orientation towards representatives of the previous era (Adam Mitskevich, Juliush Slovatsky, Andrzej Toviansky) with simultaneous rejection of some principles of romantic art.

**Keywords**: Adam Asnyk, cultural and historical paradigm, Belarusian-Polish literary borderland

**Abstrakt**

Celem artykułu jest analiza stylu poetyckiego liryki Adama Asnyka, opis podstaw ideowo-estetycznych jego metody twórczej, a także określenie miejsca i roli tego wybitnego przedstawi-

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 26/12/2024 08:20:51



ciela literatury polskiej w nawiązaniu do białoruskiego paradygmatu kulturowo-historycznego. Na podstawie wybranych utworów literackich autor wskazuje interpretacje artystyczne Asnyka szeregu zagadnień, które niepokoiły zarówno jego samego, jak i społeczeństwo polskie w dobie postromantyzmu. Należy zauważyć, że A. Asnyk pochodził z tzw. „ruskiej" Polski, tj. regionów, które w wyniku zaborów Rzeczypospolitej wraz z Wielkim Księstwem Litewskim (ziemie białoruskie) weszły w skład Imperium Rosyjskiego. Fakt ten był nie tylko jednym z głównych czynników, które wpłynęły na kształtowanie się świadomości twórczej samego A. Asnyka, ale także kluczem do wyjaśnienia, jak i dlaczego wiersze poety wywarły wpływ na białoruskich pisarzy – Janka Łuczynę, Janka Kupałę, Zośkę Wieras, Janka Bryla. Ponadto znaczące zainteresowanie Białorusinów polskim autorem można objaśnić wspólnymi polsko-białoruskimi wartościami i tradycjami kulturowo-historycznymi, a także nawiązaniem do przedstawicieli poprzedniej epoki (Adama Mickiewicza, Juliusza Słowackiego, Andrzeja Towiańskiego) przy jednoczesnym odrzuceniu niektórych zasad estetycznych epoki romantyzmu.

**Słowa kluczowe**: Adam Asnyk, paradygmat kulturowo-historyczny, białorusko-polskie pogranicze literackie

**Анатацыя**

Мэтай артыкула з'яўляецца вывучэнне мастацкіх асаблівасцей лірыкі Адама Асныка, аналіз ідэйна-эстэтычных асноў яго творчага метаду і паэтычнага стылю, а таксама навуковае асэнсаванне месца і ролі гэтага яркага прадстаўніка польскай літаратуры ўнутры беларускай культурна-гістарычнай парадыгмы. Для рэалізацыі дадзенай мэты на прыкладзе асобных вершаў былі паказаны спосабы мастацкай інтэрпрэтацыі паэтам шэрагу пытанняў, якія хвалявалі і яго самога, і польскае грамадства ў эпоху пострамантызму. Варта заўважыць, што А. Аснык з'яўляўся выхадцам з так званай „рускай" Польшчы – тых рэгіёнаў, якія пасля падзелу Рэчы Паспалітай разам з землямі Вялікага Княства Літоўскага (беларускімі землямі) увайшлі ў склад Расійскай імперыі. Гэты факт становіцца не толькі адным з галоўных фактараў, якія паўплывалі на асаблівасць фармавання творчай свядомасці самога А. Асныка, але і ключом да тлумачэння, як і чаму яго паэзія знаходзіла водгук у беларускіх літаратараў – Янкі Лучыны, Янкі Купалы, Зоські Верас, Янкі Брыля. Таксама непадробная цікавасць беларусаў да польскага аўтара тлумачыцца агульнымі культурна-гістарычнымі каштоўнасцямі і традыцыямі, аналагічнай арыентацыяй на прадстаўнікоў папярэдняй эпохі (Адама Міцкевіча, Юльюша Славацкага, Анджэя Тавяньскага) з адначасовым непрыманнем некаторых прынцыпаў рамантычнага мастацтва.

**Ключавыя словы**: Адам Аснык, культурна-гістарычная парадыгма, беларуска-польскае літаратурнае памежжа

Сярод найбольш важных фактараў фарміравання вербальнай прасторы колішняй Рэчы Паспалітай і яе мастацка-эстэтычнай канцэпцыі ў пострамантычны перыяд (1863–1889) становіцца творчая інтэрпрэтацыя (у пэўным сэнсе нават сублімацыя) пісьменнікамі таго сумнага досведу, які быў атрыманы імі ў выніку асэнсавання наступстваў Студзеньскага паўстання 1863–

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 26/12/2024 08:20:51



1864 гг. Адзін з такіх творцаў – Адам Аснык, выдатны паэт і драматург, адзін з нямногіх, хто змог „узняцца над рамантычным эпігонствам і пазітывісцкай бясплоднасцю[1]" (Gorskij, 1997, s. 398), ураджэнец „рускай Польшчы", то бок земляў, якія пасля падзелаў Рэчы Паспалітай адышлі царскай Расіі (родны горад пісьменніка – Каліш). Трагічная гісторыя „малой" і „вялікай" радзімы цесна пераплялася з сямейнай і ўласнай гісторыяй паэта (бацька за ўдзел у Лістападаўскім паўстанні быў пакараны высылкай у Сібір, а потым і ён сам, удзельнік Студзеньскага паўстання, зазнаў пераслед з боку ўладаў), што, несумненна, вельмі моцна паўплывала на фармаванне творчай свядомасці А. Асныка, шчыльна наблізіўшы яго мастацкі свет да творцаў і чытачоў з усходніх „крэсаў". Нездарма Марыя Шыпоўская, аўтар грунтоўнай манаграфіі *Asnyk znany i nieznany* (*Аснык вядомы і невядомы*), сцвярджае, што тэксты Адама Міцкевіча для яго цёзкі з'ўляліся не проста літаратурнымі творамі, „сведчаннем нейкіх далёкіх гістарычных падзей, але хіба што таксама і часткай найбліжэйшай, сямейнай традыцыі" (Szypowska, 1971, s. 13). Ды і сама постаць вешчуна мела для А. Асныка выключнае значэнне, аб чым сведчаць хоць бы верш *W dzień złożenia zwłok Mickiewicza na Wawelu* (*У дзень пахавання праху Міцкевіча на Вавелі*), у якім А. Міцкевіч паўстае як першы абаронца гонару і годнасці зганьбаванай ворагамі Айчыны, як сапраўдны народны герой-асілак, што сваімі маральнымі якасцямі пераўзыходзіць вялікіх палкаводцаў, а таму здольны не толькі ўзняць згублены штандар Рэчы Паспалітай – „Znak królewski z orłem i pogonią" (Asnyk, 1960, s. 400), але і замяніць яго ў „светлы штандар духа":

Gdy go w strzępki stargała niewola
I pokryła noc milczenia głucha...
On go pierwszy uniósł z walki pola
I zamienił w jasny sztandar ducha
(Asnyk, 1960, s. 400).

Аднак аўтару працытаваных радкоў бліжэй па духу ўсё ж не А. Міцкевіч, а другі вялікі рамантык Юльюш Славацкі, чые містычныя ідэі прыйшліся даспадобы А. Асныку і знайшлі прынамсі частковае ўвасабленне ў яго ўласнай творчасці. І не толькі паэтычнай. Згадаем хоць бы эсэ *Król Duch Słowackiego* (*Кароль Дух Славацкага*), дзе згаданай паэме адводзіцца вельмі ж унікальнае, а таму ганаровае месца: „Кароль Дух – гэта самае аўтаномнае і самае арыгінальнае тварэнне Славацкага, для якога не магчыма адшукаць ні паралелей ні аналогій сярод усяго паэтычнага мастацтва" (Asnyk, 1879, s. 403). Адсутнасць літаратурных аналогій для гістарычна-філасофскай паэмы Ю. Славацкага А. Аснык тлумачыць уплывам на паэта містычна-рэлігійнай дактрыны Анджэя Тавяньскага, не звязанай ні з адной вядомай мастацкай традыцыяй. Варта заўважыць, вучэнне, „пад-

[1] Тут і далей пераклад цытат з рускай і польскай мовы аўтара артыкула.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 26/12/2024 08:20:51



хопленае ў размытых абрысах ад настаўніка і высока ўзнятае на крылах багатай і прагнай да чыстых ідэалаў фантазіі" (Asnyk, 1879, s. 402), не знайшло належнай падтрымкі ў польскім творчым асяроддзі часоў пострамантызму, таму *Кароль Дух* Ю. Славацкага, пакінуты без увагі літаратуразнаўцамі і нават літаратурнымі крытыкамі, „заставаўся ў ізаляцыі нібы Сфінкс пасярод пустэльні" (Asnyk, 1879, s. 401). Сваім эсэ, а крыху пазней праз цыкл філасофскіх санетаў *Nad głębiami* (*Над глыбінямі*) А. Аснык спрабаваў вызваліць з палону адзіноты „Сфінкса", а таксама адрадзіць іншыя рамантычныя ідэі Ю. Славацкага, генетычна звязаныя з тавянізмам і яго „нябачнай краінай духа, населенай незлічонымі полчышчамі духаў рознай прыроды" (Towiański, 1882, s. 1). Усе гэтыя спробы прынеслі яму адначасова і славу інтэлектуала, і майстра прыгожага пісьменства, здольнага паэтычным словам „супакойваць і акрыляць спакутаваныя душы тых, што разам з ім прайшлі Крыжовай дарогай 1861–1864 гг." (Chlebowski, 1923, s. 418). А як вядома, вялікая канцэнтрацыя „спакутаваных душ" мелася зусім не там, дзе пачынаў свой жыццёвы і творчы шлях А. Аснык, а на ўсход ад яго родных мясцін – у гістарычнай Літве. Таму для большасці чытачоў (і шараговых, і прафесійных), якія паходзілі з беларуска-польскага памежжа і былі ўзгадаваныя на тых самых народных культурных традыцыях і маральна-этычных канонах, што і А. Тавяньскі, і А. Міцкевіч, і нават Ю. Славацкі (нарадзіўся ва ўкраінскім Крэмянцы, але дзяцінства і юнацкія гады правёў у Вільні), вершы польскага пострамантыка станавіліся фактычна ў адзін шэраг з паэзіяй сваіх „мясцовых", ліцвінскіх прадстаўнікоў рамантызму. Гэтаму факту ёсць пацвярджэнні, прычым знайсці іх можна ў даволі нечаканых месцах, напрыклад, на старонках сатырычна-гумарыстычнага выдання „Plotka Wileńska" („Віленская плётка"), у адным з нумароў якога маецца невялічкая гумарэска пад назвай *Sąsiedztwo* (*Суседства*) – тэкст пра тое, як мястэчковы графаман Заразумяльскі выдрукаваў за ўласны кошт вершы і дзеліцца радасцю з прыяцелем: „Ведаеш, – кажа, – мінаючы кнігарню, бачыў на вітрыне сваю кнігу па суседству са зборнікамі паэзіі Асныка, Славацкага, Міцкевіча!" (Sokołowski, 1907, s. 5), на што сябрук адказвае: „Думаю, для цябе такое суседства вельмі… небяспечнае" (Sokołowski, 1907, s. 5). Гумарыстычны змест мініяцюры, як мы можам пераканацца, зусім не перашкаджае зрабіць сур'ёзную выснову: творчасць А. Асныка была запатрабаванай сярод жыхароў сталіцы былога Вялікага Княства Літоўскага, а значыць польскім пісьменнікам цікавіліся і ў іншых рэгіёнах, для якіх Вільня па-ранейшаму заставалася важным цэнтрам, найперш культурным. І яшчэ адзін момант, які прыцягвае ўвагу: „Plotka Wileńska" пачала выходзіць у адзін час з „Нашай Нівай" (з 1906 года), то бок патэнцыяльна абодва выданні маглі мець тых самых чытачоў, адлюстроўваць іх зацікаўленасці і разам фарміраваць густы сваёй аўдыторыі. Такім чынам, вершы А. Асныка мусілі патрапіць і да беларусаў, чыё нацыянальнае адраджэнне шукала ў тую пару надзейную апору не толькі ва ўласнай народнай культуры і сваёй гісторыі, але і ў суседніх, блізкіх па духу традыцыях. І яны патрапілі, а некаторыя нават змаглі натхніць нашых выдатных паэтаў, выклікаўшы зваротную паэтычную рэакцыю. Дарэчы, адным з першых

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 26/12/2024 08:20:51



натхніўся Янка Купала, чые жыццёвыя шляхі, між іншым, пралягаюць праз Вільню: у трэцім зборніку песняра, які і называецца адпаведна – *Шляхам жыцця*, змешчаны верш *Я хацеў бы…*, пазначаны аўтарам як „Наследаванне з Асныка". Аб'ектам наследавання стаў знакаміты *Sonet* (*Санет*), які распачынаўся радкамі „Jednego serca! tak mało, tak mało // Jednego serca trzeba mi na ziemi!" (Asnyk, 1960, s. 98). Гэты свой верш А. Аснык, можна лічыць, пакінуў без назвы: замест тытула маецца тэрмін, які сведчыць усяго толькі аб жанравай прыналежнасці твора. Янка Купала ж наадварот – даў найменне свайму паэтычнаму тэксту-наследаванню, аднак не стаў захоўваць форму санету, сканцэнтраваўшыся выключна на ідэйным змесце польскай першакрыніцы. Нагадаем, *Санет* А. Асныка ўяўляе адзін з лепшых узораў яго інтымнай лірыкі, гэтакую споведзь-маналог лірычнага героя, які не прагне, здавалася б, нічога звышнатуральнага – усяго толькі хоча радасці ўзаемнага кахання, але разумее, што ў сучасным свеце нават такое простае жаданне з'яўляецца раскошай: „Jednego serca! Tak mało mi trzeba, // A jednak widzę, że żądam za wiele!" (Asnyk, 1960, s. 98). Матыў нешчаслівага кахання, шырока распаўсюджаны ў літаратуры папярэдняй эпохі, дзе ён найчасцей сцвярджаў ідэю недасяжнасці рамантычнага ідэалу, па-новаму пераасэнсоўваецца аўтарам *Санету*: для пострамантыка А. Асныка колішняя недасяжнасць ідэалу трансфармуецца ў яго адсутнасць, замяняючы трагічнае светаўспрыманне на ўсведамленне поўнай катастрофы вядомага раней свету. Трэба адзначыць, што катастрафізм як форма свядомасці неўзабаве станецца характэрным для ўсёй еўрапейскай культуры канца XIX – пачатку XX ст., набываючы ў творчасці асобных аўтараў адметныя рысы, сфарміраваныя пад уплывам сваіх канкрэтных рэалій (нацыянальных і асабістых), уласных страхаў і гарызонтаў чакання. Паэзія А. Асныка ў гэтым плане апярэджвала агульнапольскія літаратурныя тэндэнцыі, таму і не патрапляла ў пазітывісцкі мэйнстрым. Падобную сітуацыю цікава тлумачыць філосаф-экзістэнцыяліст Леў Шастоў: „у законах прыроды, у парадку, у навуцы, у пазітывізме і ідэалізме – залог няшчасця, у жахах жыцця – залог будучыні. Вось аснова філасофіі трагедыі: да гэтага прыводзяць скептыцызм і песімізм" (Šestov, 2007, s. 207). Як заўважае Таццяна Захарава, „катастрафічная свядомасць бярэ пачатак у песімістычным светапоглядзе і, асноўваючыся на веры ў надыходзячую катастрофу, суправаджаецца страхам перад ёй" (Zaharova, 2012, s. 185). Скіраваны, як гэта ні дзіўна, у будучыню, мастацкі песімізм А. Асныка мае цалкам зразумелую прыроду: параза ў чарговым вызваленчым паўстанні пасеяла непераадольны змрок хаосу ў яго душы, як і ў сэрцах усяго новага пакалення барацьбітоў за адраджэнне Рэчы Паспалітай. А да таго ж і ў асабістым жыцці пісьменніка складвалася вельмі змрочная карціна: у час стварэння *Санету* ён якраз перажываў няшчаснае (бо без узаемнасці) каханне да Анелі Грудзіньскай, дзяўчыны, якую даследчыца М. Шыпоўская называе „каталізатарам любоўнай лірыкі Асныка" (Szypowska, 1971, s. 328).

Падобным трагічна-хаатычным светаадчуваннем ў "перыяд наследавання А. Асныку" поўніцца і свядомасць Янкі Купалы. У яго жыцці (і творчым, і грамадскім), запраграмаваным як і ў польскага творцы на вырашэнне не столькі

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 26/12/2024 08:20:51



надзённых праблем, колькі задач, нацэленых на далёкую перспектыву, няма спакою, ураўнаважанасці і аптымізму, бо ўсяго гэтага няма нідзе: ніхто не мог тады дакладна ведаць, што станецца з краем пасля вядомых рэвалюцыйных падзей, што будзе з беларускім нацыянальным адраджэннем, ці адбудзецца ўвогуле Беларусь як дзяржава, альбо назаўжды застанецца нязздзейсненай марай, так і не заняўшы „свой пачэсны пасад між народамі" (Kupala, 1997, s. 99). На асабістым фронце беларускага паэта таксама не мелася пажаданых удач і душэўнага спакою, таму і яго лірычны герой знаходзіцца ў пакутлівым пошуку:

Я хацеў бы душу адшукаці такую
І такое хацеў бы я сэрца знайсці,
Што са мной праз жыццёвую сцежку блудную
Захацела б супольна і згодна ісці
(Kupala, 1997, s. 122).

Наследаванне атрымалася амаль удвая большым за Аснықавы *Санэт*, таму што Янка Купала выкарыстоўвае не проста аналагічныя любоўныя матывы (і там, і тут знаходзім матыў „ jednego serca" / „аднаго сэрца"; „ jednych ust" / „адных вуснаў"; „oczu dwoje" / „вочак пару"; „rąk białych dwoje" / „ручак беленькіх двое" і інш.), але дапаўняе іх звыклым для сябе і беларускага чытача сацыяльным падтэкстам:

Вочак пару хацеў бы я мець прад сабою, –
Як у ясныя зоры, ў якія б глядзеў,
І забыўся б, што ходзіць маркотнасць за мною,
І забыўся б, што крыўды цярплю ад людзей
(Kupala, 1997, s. 122).

А вось для героя А. Асныка ўзаемнае каханне – гэта не спосаб забыцца пра зямныя няшчасці, а магчымасць увогуле ўзняцца над усім зямным, матэрыяльным, зліцца з трансцэндэнтным, атрымаўшы вечнае шчасце:

Jednych ust trzeba! Skąd bym wieczność całą
Pił napój szczęścia ustami mojemi,
I oczu dwoje, gdzie bym patrzał śmiało,
Widząc się świętym pomiędzy świętemi
(Asnyk, 1960, s. 98).

Як бачым, *Санет* А. Асныка вызначаецца даволі дзіўным спалучэннем трагізму і геданізму, чаго не скажаш пра наследаванне Янкі Купалы. Затое беларускі творца ў сваім вершы, поўным трагічнага пафасу з прычыны сацыяльнай несправядлівасці і іншых зямных нягод, не сцвярджае ў адрозненне ад польскага калегі ідэю адсутнасці ідэалу. Для нашага паэта, як і для прадстаўнікоў рамантызму,

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 26/12/2024 08:20:51



ідэал існуе, аднак па-ранейшаму застаецца недасяжным, бо такая воля самога лёсу: „Хачу мала, так мала, а доля не чуе: // Сіратой сам адзін я гібею ў глушы" (Kupala, 1997, s. 123).

З наследавання А. Асныку фактычна пачынаецца творчасць Зоські Верас (Людвікі Сівіцкай-Войцік) – пісьменніцы, чыё імя цесна знітавана з айчынным нацыянальным рухам (грамадска-палітычным, культурным і літаратурным) пачатку XX ст.: „яе можна назваць праўдзівай Пчолкай беларускага Адраджэння, руплівасцю і шчырасцю якое рабіліся многія справы" (Petruškevìč, 2009, s. 136). Гэта быў 1909 год, калі па словах самой Зоські Верас, яна „стала на тую сцежку, па якой ішла праз усё далейшае жыццё." (Veras, 2015, s. 70). А вось што піша даследчыца-архівіст Ганна Запартыка:

> Да 1909 года адносіцца і самы ранні твор Людвікі Сівіцкай, запісаны ў яе нататніках. Гэта наследаванне польскаму паэту Адаму Асныку пад назвай *Слёзы*. Верш адпавядаў тагачаснаму настрою маладой Людвікі. Найбольш дакладна гэты настрой паэткі з чулай душой да ўсяго народнага перадаваўся праз прыёмы і рытміку народнай песні. Верш А. Асныка якраз і быў тым узорам апрацаванай народнай песні, змест якой выказваў адносіны да роднага кута і сум па страчаным. У пазнейшыя гады яна яшчэ не раз будзе звяртацца да твораў А. Асныка (Zapartyka, 2015, s. 8).

Сапраўды, у Зоські Верас ёсць яшчэ некалькі вершаў, напісаных „паводле Адама Асныка", адзін з якіх датуецца 1913 годам і апелюе да згаданага вышэй *Санету* – таго самага, што натхніў і Янку Купалу, пры чым у той жа прыкладна час. Наўрад ці гэта супадзенне – хутчэй заканамернасць, якая сведчыць пра блізкасць мастацка-эстэтычных ідэй польскага пострамантыка беларускаму творчаму андэграўнду пачатку XX ст. Канешне, ён не быў настолькі папулярным як паэтырамантыкі – выхадцы з беларуска-польскага літаратурнага памежжа. Тая ж Зоська Верас згадвае: „З улюбёнымі паэтамі бацькі – А. Міцкевічам і У. Сыракомлем – я пазнаёмілася, маючы 10 гадоў" (Veras, 2015, s. 69). То бок, А. Аснык не першы. Яго „выцесніла" з польскіх і беларускіх чытацкіх „рэйтынгаў" нават Марыя Канапніцкая са сваёй „багатай, але ніжэйшай паводле мастацкай вартасці творчасцю" (Chlebowski, 1923, s. 415): у згаданага раней Янкі Купалы, напомнім, ёсць шмат перакладзеных вершаў М. Канапніцкай, А. Міцкевіча і У. Сыракомлі, а з А. Асныка маецца толькі адно наследаванне. Дарэчы, Зоська Верас планавала, відаць, здзейсніць усё ж такі пераклад знакамітага *Санету*, але па невядомым прычынам не давяла да канца задуманае. Аб гэтым прынамсі сведчыць захаванне аналагічнага асныкаўскага рытму, максімальна блізкае метафарычна-вобразнае і сэнсавае ўзнаўленне асобных радкоў, а таксама дэкларацыя той змрочнай ідэі (немагчымасці наблізіцца да ідэалу, бо яго не існуе), якую паэт схаваў у заключных радках і ад якой адмовіўся аўтар зборніка *Шляхам жыцця*: „Але ж адно я толькі ясна бачу: // Што я жадаю замнога… замнога…" (Veras, 2015, s. 24).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 26/12/2024 08:20:51



Варта згадаць яшчэ адзін верш Зоські Верас, які называецца *Сум* і мае падтытул „паводле Адама Асныка”. Датуецца ён сакавіком 1920 года, а гэта адзін з найбольш трагічных перыядаў у жыцці паэткі: месяцам раней першы муж Фабіян Шантыр быў мабілізаваны ў Чырвоную Армію, пакінуўшы яе з аднагадовым сынам на руках. Нядобрыя прадчуванні (абвінавачаны ў контррэвалюцыйнай дзейнасці, Ф. Шантыр у хуткім часе быў арыштаваны і расстраляны) выліліся ў шчымлівыя, поўныя горычы і тужлівай безвыходнасці радкі:

Над маею душой,
поўнай дум,
Шэрыя скрыллі прасцёр
ціхі Сум.
Мае вочы ўпіліся
ў яго твар.
Ён з іх выссаў усенькі
жыццёвы жар
(Veras, 2015, s. 27).

Дадзены верш хутчэй за ўсё быў навеяны паэмай А. Асныка *Sen grobów* (*Сон магіл*), напісанай у духу дантаўскай традыцыі, а дакладней, першымі яе строфамі, дзе перад вачыма героя, заблукалага сярод ночы ў нейкай ледзяной прасторы паміж небам і снегам, паўстаюць змрочныя пустыя краявіды, трывожны змрок якіх ахінае савінымі крыламі вандроўцу і быццам высмоктвае з яго жыццёвыя сілы, пакідаючы ў душы страх, а ў свядомасці – змярцвеласць:

W posępną nocy zaszedłem krainę,
Po śniegu, co się usuwał pode mną –
I przez powietrze zmrożone i sine,

Które zawisło nad przepaścią ciemną,
Rzucałem trwożne spojrzenia w pustkowie,
Bo czułem trwogę w mej piersi nikczemną.

Włos mi się jeżył, przymarzły na głowie,
Na duszę dziwna przerażeń zmartwiałość
Spadła i skrzydła rozpostarła sowie <…>
(Asnyk, 1960, s. 154).

Нельга абмінуць той факт, што ў паэме А. Асныка *Сон магіл* апроч уплыву *Боскай камедыі* Дантэ, нязменна прысутнічаюць мастацкія, эстэтычныя і філасофскія ідэі Ю. Славацкага. На пераемнасць звяртае ўвагу і вядомы гісторык літаратуры Юзаф Траццяк: „сам ход паэмы і яе дзікі каларыт прыпамінаюць

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 26/12/2024 08:20:51



вельмі часта музу Славацкага, а галоўная ідэя, наколькі можна яе ўлавіць, запазычана з *Караля Духа*" (Tretiak, 1922, s. 19). Не забывайма, што ў сваю чаргу ідэйныя вытокі згаданай паэмы Ю. Славацкага ляжаць у містычным вучэнні А. Тавяньскага, якім натхняліся многія прадстаўнікі беларуска-польскага літаратурнага памежжа – ад Яна Баршчэўскага да Арцёма Вярыгі-Дарэўскага (ужо нават не гаворачы пра вядомы ўсяму свету ўплыў тавянізму на творчую свядомасць А. Міцкевіча). У гэтым, як нам здаецца, хаваецца адна з прычына прыцягальнасці мастацкага свету А. Асныка для літаратараў з усходніх „крэсаў" даўняй Рэчы Паспалітай: паэт спавядае спрадвеку вядомую ім суровую веру ў лёс, што накіроўвае паступальны, магчыма жорсткі, але канчаткова справядлівы ход гісторыі. У *Сне магіл*, дарэчы, сустракаецца вобраз анёла Лёсу, які асцерагае лірычнага героя, каб той не наракаў на сваю долю і не чакаў ад яе прыхільнасці:

„I ty więc losów nie pragnij odmiany,
Nie żądaj nigdy łaski ni przebaczeń".
„Kto ty? – spytałem – duchu niezbłagany!"
A on mi na to: „Jam anioł przeznaczeń"
(Asnyk, 1960, s. 166).

Зрэшты, прыцягваў А. Аснык тую ж Зоську Верас, альбо Янку Купалу не толькі змрочнай эстэтыкай і ўрачыстай меланхалічнасцю, але найперш задуменным лірызмам і галантным эратызмам, якіх пакуль яшчэ не ставала маладой беларускай літаратуры часоў „нашаніўства". Пазней, калі ўсяго гэтага будзе дастаткова, аслабне ўплыў і А. Асныка. Затое на пэўным этапе прысутнасць яго ў айчыннай культурна-гістарычнай парадыгме цалкам відавочная. І няхай наш пясняр не перакладаў творы гэтага польскага аўтара, аднак вучыўся ў яго, напрыклад, майстэрству балансаваць паміж жыццесцвярджальнасцю рамантычнай традыцыі і ўпадніцтвам філасофіі трагедыі, альбо няпростай працы над складанымі, але дасканалымі паэтычнымі формамі. Нездарма Вячаслаў Рагойша, разважаючы над мастацкай прыродай польскамоўных санетаў Янкі Купалы, сярод шэрагу творцаў, на якіх мог арыентавацца беларускі паэт, называе і пісьменніка з Каліша: „вытрыманыя ў духу традыцый польскіх санетапісцаў (А. Міцкевіча, Ю. Славацкага, А. Асныка, М. Канапніцкай, Я. Каспровіча і інш.), купалаўскія санеты, аднак, вызначаліся сваёй сацыяльнай і нацыянальнай беларускай канкрэтыкай" (Ragojša, 2012, s. 76–77).

Пра цікавасць да постаці А. Асныка з боку пісьменнікаў, што належаць да беларускага культурнага канону, сведчаць не толькі паэтычныя наследаванні асобных матываў, вобразаў і эстэтычных ідэй польскага аўтара, але і наяўнасць перакладаў яго вершаў. Першым заняўся гэтай нялёгкай справай Ян Неслухоўскі (ён жа – Янка Лучына, адзін з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры). Праўда, перакладаць паэзію А. Асныка мінскі літаратар вырашыў не на беларускую мову, як гэта было зроблена ў дачыненні да шэрагу твораў У. Сыракомлі, а на рускую.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 26/12/2024 08:20:51



Уладзімір Мархель тлумачыць дадзены факт тым, што „Янка Лучына ўскладаў на сябе ролю пасрэдніка паміж польскай і рускай літаратурамі. Дзеля паглыблення польска-рускага літаратурнага ўзаемазнаёмства і збліжэння” (Marhel′, 2001, s. 20). Сапраўды, ідэя заняцца перакладам паэзіі А. Асныка на рускую мову магла ўзнікнуць у Я. Неслухоўскага ў канцы 80-х гг. (фрагменты перакладаў пяці вершаў датуюцца 1888 годам), бо на той момант у расійскіх літаратурных колах пра гэтага польскага аўтара яшчэ мала хто і чуў. Толькі ў 1906 г., калі ўжо не стане ні паэта, ні яго перакладчыка (А. Аснык і Я. Неслухоўскі адышлі ў іншы свет у 1897 г. з розніцай у некалькі дзён), у пецярбургскім часопісе „Славянские известия” філолаг-славіст Аляксандр Яцымірскі зробіць грунтоўны агляд жыцця і творчасці літаратара з Каліша, адзначыўшы між іншым, што „на рускую мову перакладзена вельмі мала з Асныка, галоўным чынам М. Гербаноўскім (Лепестки, Спб. 1903 г.)” (Âcimirskij, 1906, s. 221). Як бачым, аўтар агляду апроч Міхаіла Гербаноўскага не згадвае нікога іншага, хоць, прыкладна ў той жа час Іван Бунін таксама выступаў у якасці перакладчыка А. Асныка. Гэта якраз сведчыць пра наяўнасць пэўных прабелаў у польска-расійскіх літаратурных сувязях напрыканцы XIX ст., а значыць і клопат Я. Неслухоўскага быў небеспадстаўным. Вядома, беларускі літаратар мог мець і другія планы на паэзію А. Асныка, а можа нават і здзейсніў пераклад якіх-небудзь яго радкоў на родную мову, аднак дакументальнага пацвярджэння гэтай здагадцы, на жаль, няма. Таму застаецца толькі прыгледзецца да вершаў, абраных для перакладу, бо іх выбар у любым выпадку сведчыць пра пэўныя мастацка-эстэтычныя прэферэнцыі Янкі Лучыны. А выбраў наш зямляк наступныя творы: *Publiczność do poetów* (*Публіка да паэтаў*); *Poeci do publiczności* (*Паэты да публікі*); *Zwiędły listek* (*Звялы лісток*); *Katień* (*Камень*); *Daremne żale* (*Дарэмныя шкадаванні*). Першыя два вершы складаюць адно цэлае – дыптых *Publiczność i poeci* (*Публіка і паэты*), у якім А. Аснык звяртаецца да тэмы няпростых стасункаў паміж творцамі і астатнім светам людзей. Матыў падобнага супрацьстаяння існаваў ва ўсе літаратурныя эпохі, аднак найбольш яркім і запамінальным яго зрабілі рамантыкі, увёўшы ў свае тэксты героя-бунтара, які не хоча падпарадкоўвацца згрыбелым законам грамадства. Праўда, як заўважае Віктар Ванслаў, „калі браць рамантызм у цэлым, дык можна сказаць, што ў ім індывідуалістычныя тэндэнцыі спалучаліся з антыіндывідуалістычнымі” (Vanslov, 1966, s. 78), то бок адны рамантыкі ўзвышалі асобу над натоўпам людзей, а другія ў той самы час „крытыкавалі буржуазны індывідуалізм, які разбурае адзінства асобы і грамадства” (Vanslov, 1966, s. 78). Дык вось А. Аснык у сваім дыптыху спрабуе аб'яднаць гэтыя дзве крайнасці рамантычнай традыцыі, па чарзе становячыся то па адзін, то па другі бок барыкадаў, а то і ўвогуле дыстансуецца ад усіх апанентаў, не жадаючы прымаць аргументаў ні паэтаў, ні публікі. Адным словам, тут праявілася ўся парадаксальнасць і супярэчлівасць творчай натуры аўтара. Нездарма А. Яцымірскі сцвярджаў, што „ва ўсёй польскай літаратуры пераходнага перыяду наўрад ці знойдзецца другі такі ж дваісты, такі ж неўраўнаважаны паэт, як Аснык”

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 26/12/2024 08:20:51



(Âcimirskij, 1906, s. 218). Зрэшты, фінал дыптыха расстаўляе ўсё на свае месцы. Аўтар прыходзіць да высновы, што не гледзячы на ўсе разнагалоссі, паміж паэтам і грамадствам існуе непарыўная сувязь і заўсёдная ўзаемаабумоўленасць:

Godzim się na to... Potępcie, gdy chcecie;
Przy was jest słuszność, przy was jest zwycięstwo;
Lecz tę rozważcie smutną okoliczność:
Tacy poeci, jaka jest publiczność!
(Asnyk, 1960, s. 20).

Тое, што Янку Лучыну прыцягнуў такі неадназначны ў ідэйна-эстэтычных адносінах твор, гаворыць і пра некаторыя супярэчнасці ў яго ўласнай душы, пра сітуацыю пэўнай дэзарыентацыі, у якой ён апынуўся, разрываючыся нават не ў двоістасці, а ў траістасці – паміж учарашняй „польскасцю”, сённяшняй „расійскасцю” і мройнай „беларускасцю”. А яшчэ паэт бачыў прыгажосць не ў штучна выкшталцоных, а ў натуральных, сціплых (на ўзор народнай паэзіі) формах, якія маглі між тым валодаць бяздонным вобразна-выяўленчым патэнцыялам. Усё гэта ёсць у вершы А. Асныка *Звялы лісток*: просты па форме, твор утрымлівае мноства складаных кантэкстаў і, як лічыць Войцех Хамерскі, „можа выконваць функцыю паэтычнага крэда” (Hamerski, 2011, s. 137). Бо тут ёсць сапраўды ўсё – ад зашыфраванага фрагменту асабістай біяграфіі (закаханы ў А. Грудзіньскую, паэт дасылаў ёй лісты, але яны ігнараваліся адрасатам і вобраз лістка белай ружы ў тэксце на гэта акурат намякае) да палемікі з мастацкай сістэмай рамантызму, якая хоць і прываблівала А. Асныка, аднак ужо даўно не адпавядала патрэбам сучаснасці. Вось чаму лірычны герой верша, які ўласнаручна запісаў на лістку ўсё тое невымоўнае, што трывожыла сэрца, не змог пазней нічога з напісанага прачытаць:

Lecz kiedy me wyrazy
Chciałem odczytać znów,
Dojrzałem w listku skazy,
Nie mogłem dostrzedz słów
(Asnyk, 1960, s. 38).

Невыпадкова ў полі зроку Янкі Лучыны аказаліся таксама вершы А. Асныка *Камень* і *Дарэмныя шкадаванні*, якія ўвасабляюць імкненне чалавецтва ў будучыню насуперак любым перашкодам. Натуральны ход гісторыі стрымаць немагчыма, як бы гэтага не хацелася каму-небудзь – вось дамінантны матыў абодвух вершаў. Адзінае, верш *Камень* утрымлівае ў сабе значна багацейшы арсенал мастацкіх сродкаў, здольных апеляваць да самых розных філасофскіх ідэй: на думку Юліі Вележыньскай, „трохі ў ім ёсць шэлінгаўска-гегелеўскага тону і быццам бы злёгку прабіваецца Славацкі” (Wieleżyńska, 1930, s. 43). Даследчыца

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 26/12/2024 08:20:51



нават дапускае магчымасць існавання паралелей паміж *Камнем* і *Манадалогіяй* Готфрыда Лейбніца, але адразу агаворваецца, што так можна было б сцвярджаць толькі ў тым выпадку, „калі б замест звыклага інтэлектуалізму не ляжала на гэтым вершы заўважная больш чым дзе яшчэ ў Асныка пячатка эмацыянальнасці” (Wieleżyńska, 1930, s. 43). Што да верша *Дарэмныя шкадаванні*, то ён таксама пабудаваны на вельмі эмацыянальнай аснове, хаця лірычны герой заклікае прыняць бок не пачуццёвасці, а рацыянальнасці. Бо менавіта ў гэтым кірунку крочыць сучасны свет, які не церпіць у свой адрас нараканняў, не прымае жадных апеляцый, не пакідае ніводнага шансу сваім апанентам:

> Świat wam nie odda, idąc wstecz,
> Zniknionych mar szeregu –
> Nie zdoła ogień ani miecz
> Powstrzymać myśli w biegu
> (Asnyk, 1960, s. 244).

*Дарэмныя шкадаванні* А. Асныка, дарэчы, выклікаюць нечаканую асацыяцыю з *Пагоняй* Максіма Багдановіча, дзе таксама „сэнсавыяўленчую ролю адыгрываюць удала падабраныя дзеясловы з семантыкай градацыі руху” (Mel′nìkava, 2011, s. 391). Зрэшты, у песняра чыстай красы можна знайсці больш канкрэтныя кропкі судакранання з польскім пострамантыкам. Напрыклад, іх аб’ядноўваюць агульныя літаратурныя густы, скажам, любоў да паэзіі Генрыха Гейнэ, чые вершы яны абодва ўшанавалі ўласнымі перакладамі. Характарызуючы творчую паставу А. Асныка, Браніслаў Хлябоўскі адзначае: „У выяўленні сваіх пачуццяў ён нагадваў Гейнэ, без яго насмешлівасці, а ў зліцці ідэалаў свайго сэрца з вынікамі філасофіі і навукі – творчасць Сюлі-Прудома” (Chlebowski, 1923, s. 415). Таго самага, нагадаем, Сюлі-Прудома, першага лаўрэата Нобелеўскай прэміі па літаратуры, радкі якога ў выглядзе эпіграфа ачолілі знакаміты багдановічаўскі *Раманс* (*Зорка Венера ўзышла над зямлёю*).

Як бачым, творчасць А. Асныка даволі гарманічна ўпісваецца ў айчынную культурна-гістарычную парадыгму, асабліва калі разглядаць канец XIX – пачатак XX ст., час адыходу (яшчэ пакуль не поўнага) агульных для Польшчы і Беларусі вербальных традыцый, найперш рамантычных. Таксама гэта быў лёсавызначальны час для абодвух народаў, якія імкнуліся да свабоды і дзяржаўнасці, што ў выніку збліжала і мастацка-эстэтычныя сістэмы кожнай з нацыянальных літаратур. Наша айчынная літаратура, вырашаючы на дадзеным этапе не толькі эстэтычныя задачы, не заўсёды паспявала за суседзямі, таму, магчыма, і постаць А. Асныка ў нейкі момант выпала з беларускага кантэксту. Зрэдку тая постаць, канечне, вярталася (і вяртаецца) ў поле зроку асобных творцаў, асабліва звязаных з беларуска-польскім культурным памежжам. Варта згадаць хоць бы Чэслава Немэна – вядомага ўсяму свету польскага музыканта, кампазітара і спевака беларускага паходжання, аўтара, між іншым, песень і на Асныкавыя вершы, сярод якіх ёсць знакаміты *Са-*

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 26/12/2024 08:20:51



*нет*, што натхняў да творчасці Янку Купалу і Зоську Верас. Знаходзім водгулле захаплення паэзіяй А. Асныка і ў Янкі Брыля. У запісах двухтысячнага года народны пісьменнік згадвае, як выбіраў паштоўкі, „каб імі павіншаваць сваіх немінчанак з 8 сакавіка" (Bryl′, 2017, s. 313), а калі справа дайшла да Ніны Мацяш, у свядомасці раптам усплылі з юнацтва вядомыя радкі:

Siedzi ptaszek na drzewie
I ludziom się dziwuje,
Że najmędrszy z nich nie wie,
Gdzie się szczęście znajduje
(Asnyk, 1960, s. 75).

З працытаванага чатырохрадкоўя пачынаецца адзін з самых вядомых вершаў польскага аўтара пра марныя пошукі чалавечага шчасця. Як заўважыў яшчэ А. Яцымірскі, „каханне і шчасце – сінонімы для Асныка" (Âcimirskij, 1906, s. 228), але ў той жа час каханне для паэта найчасцей сімвалізуе недасяжнасць (альбо нават і адсутнасць) ідэалу. З дадзенага твору таксама вынікае, што шчасця дасягнуць немагчыма, але не таму, што яго не існуе, а па прычыне духоўнай слепаты чалавека:

Bo szukają dokoła,
Tam gdzie nigdy nie bywa,
Pot się leje im z czoła,
Cierń im stopy rozrywa.

Trwonią życia dzień jasny
Na zabiegi i żale,
Tylko w piersi swej własnéj
Nie szukają go wcale
(Asnyk, 1960, s. 75).

Янка Брыль таксама распавядае, што ў маладосці нават пераклаў гэты верш, але, праўда, на рускую мову (як і некалі яго цёзка Ян Неслухоўскі): шлях да беларускасці, як бачым, не ў аднаго айчыннага творцы пачынаўся падобным чынам, але добра, што многія паслухаліся парады А. Асныка – заглянулі ўглыб уласнага сэрца і зрабілі ўрэшце шчаслівы для Беларусі выбар. Гісторыя, расказаная Я. Брылём, мае аснькаўскую элегічную афарбоўку: пісьменнік са скрухай адзначае, што ні ў Н. Мацяш, ні ў яго хатняй бібліятэцы не знайшлося кніжак гэтага выдатнага польскага аўтара. „Што ж, – піша ён, – Асныка ў нас амаль зусім, а можна сказаць і зусім не ведаюць. Дый у Польшчы, багатай на сапраўдных паэтаў, ён далекавата не з першых" (Bryl′, 2017, s. 313). Вельмі хочацца спадзявацца, што сітуацыя зменіцца і гэты творца вернецца да нас, вернецца і ў бе-

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 26/12/2024 08:20:51



ларускі, і агульнаеўрапейскі культурна-гістарычны кантэкст. Дарэчы і ў такога змрочнага паэта, як А. Аснык, можна знайсці словы, здольныя напоўніць сэрца і душу сапраўдным аптымізмам:

Miejmy nadzieję!… nie tę lichą, marną,
Co rdzeń spruchniały w wątły kwiat ubiera,
Lecz tę niezłomną, która tkwi jak ziarno
Przyszłych poświęceń w duszy bohatera
(Asnyk, 1960, s. 213).

Зрэшты, паступова паэзія А. Асныка ўсё ж вяртаецца. Два цікавыя ўзоры яго інтымнай лірыкі – *Звялы лісток*, на які некалі звярнуў увагу Я. Неслухоўскі, а таксама верш *Między nami nic nie było* (*Нас нічога не злучала*) змясціла ў кнізе вершаў і перакладаў *Прыватныя рымляне* Ірына Багдановіч, здолеўшы захаваць не толькі ўнутранае напаўненне аснykаўскіх тэкстаў (аналагічныя, альбо максімальна блізкія да арыгіналу вобразы, матывы), але і тую самую непаўторную іх мелодыку:

Калі ж хацеў нанова
Усё перачытаць,
Ніводнага там слова
Не мог я разабраць
(Bagdanovìč, 2006, s. 81).

А яшчэ той самы верш пра здзіўленую птушку, які аднойчы малады Я. Брыль узнавіў па-руску, урэшце загучаў і на беларускай мове ў перакладзе Інэсы Кур’ян:

З дрэва птушка з падзівам
На людзей паглядае:
Кожны з іх, нешчаслівых,
Не там шчасце шукае
(Asnyk, 2007, s. 128).

Дзе б там ні шукаў шчасця паэт Адам Аснык, яго пошукі не былі марнымі, бо прывялі прынамсі да стварэння прыгожых вершаў, якія знайшлі ўдзячных чытачоў, інтэрпрэтатараў і перакладчыкаў не толькі на радзіме, але і за яе межамі, у тым ліку і сярод беларускіх пашаноўнікаў прыгожага пісьменства.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 26/12/2024 08:20:51



## REFERENCES / BIBLIOGRAFIA

Asnyk, Adam. (1879). Król Duch Słowackiego. *Przewodnik Naukowy i Literacki: dodatek miesięczny do „Gazety Lwowskiej"*, 7, s. 401–421.

Asnyk, Adam. (1960). *Poezje wybrane*. Kraków: Wydawnictwo Literackie.

Asnyk, Adam. (2007). Z drèva ptuška z padzìvam. U: *Kalârovaâ karova: Antalogìâ pol'skaj dzìcâčaj paèzìì* (s. 128). Mìnsk: Ì. P. Logvìnaŭ. [Аснык, Адам. (2007). З дрэва птушка з падзівам. У: *Каляровая карова: Анталогія польскай дзіцячай паэзіі* (с. 128). Мінск: І. П. Логвінаў].

Âcimirskij, Aleksandr. (1906). Adam Asnyk. Literaturnaâ harakteristika. *Slavânskie izvestiâ*, 3, s. 218–236. [Яцимирский, Александр. (1906). Адам Аснык. Литературная характеристика. *Славянские известия*, 3, с. 218–236].

Bagdanovìč, Ìryna. (2006). *Pryvatnyâ rymlâne*. Mìnsk: drukarnâ „Triclinium". [Багдановіч, Ірына. (2006). *Прыватныя рымляне*. Мінск: друкарня „Triclinium"].

Bryl′, Ânka. (2017). *Âŝčè raz pra večnae: apovescì, apavâdannì, mìnìâcûry ì zapìsy.* Mìnsk: Mastackaâ lìtaratura. [Брыль, Янка. (2017). *Яшчэ раз пра вечнае: аповесці, апавяданні, мініяцюры і запісы*. Мінск: Мастацкая літаратура].

Chlebowski, Bronisław. (1923). *Literatura polska. 1795–1905*. Lwów–Warszawa–Kraków: Wydawnictwo Zakładu Narodowego Imienia Ossolińskich.

Gorskij, Ivan. (1997). *Pol'skaâ literatura*. W: Sergej Nikol′skij (otv. red.). (1997). *Istoriâ literatur zapadnyh i ûžnyh slavân*. T. 2: *Formirovanie i razvitie literatur Novogo vremeni. Vtoraâ polovina XVIII veka – 80-e gody XIX veka* (s. 367–403). Moskva: Indrik. [Горский, Иван. (1997). *Польская литература*. В: Сергей Никольский (отв. ред.) (1997). *История литератур западных и южных славян.* Т. 2: *Формирование и развитие литератур Нового времени. Вторая половина XVIII века – 80-е годы XIX века* (с. 367–403). Москва: Индрик].

Hamerski, Wojciech. (2011). Trzy zwiędłe liście, trzy smutne wiersze (Garczyński, Lenartowicz, Asnyk). *Poznańskie Studia Polonistyczne. Seria Literacka*, 18: *Elegia i elegijność*, s. 125–145.

Kupala, Ânka. (1997). *Poŭny zbor tvoraŭ* u 9 t. T. 3: *Veršy, peraklady 1911–1914*. Mìnsk: Mastackaâ lìtaratura. [Купала, Янка. (1997). *Поўны збор твораў* у 9 т. Т. 3: *Вершы, пераклады 1911–1914*. Мінск: Мастацкая літаратура].

Marhel′, Uladzìmìr. (2001). Pìsalasâ ŭ dobraj very... U: Ânka Lučyna. *Tvory: Veršy, narysy, peraklady, lìsty* (s. 5–22). Mìnsk: Mastackaâ lìtaratura. [Мархель, Уладзімір. (2001). Пісалася ў добрай веры… У: Янка Лучына. *Творы: Вершы, нарысы, пераклады, лісты* (с. 5–22). Мінск: Мастацкая літаратура].

Mel′nìkava, Zoâ. (2011). „Pagonâ". U: *Maksìm Bagdanovìč: èncyklapedyâ* (s. 391–393). Mìnsk: Belarus. Èncykl. ìmâ P. Broŭkì. [Мельнікава, Зоя. (2011). „Пагоня". У: *Максім Багдановіч: энцыклапедыя* (с. 391–393). Мінск: Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі].

Petruškevìč, Ala. (2009). *Nekatoryâ staronkì belaruskaj lìtaratury pačatku XX stagoddzâ*. Grodna: GrDU. [Петрушкевіч, Ала. (2009). *Некаторыя старонкі беларускай літаратуры пачатку ХХ стагоддзя*. Гродна: ГрДУ].

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 26/12/2024 08:20:51



Ragojša, Vâčaslaŭ. (2012). *Moj Tryglaŭ: Knìga pra Ânku Kupalu, Âkuba Kolasa, Maksìma Bagdanovìča*. Mìnsk: Knìgazbor. [Рагойша, Вячаслаў. (2012). *Мой Трыглаў: Кніга пра Янку Купалу, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча*. Мінск: Кнігазбор].

Sokołowski, Kazimierz. (1907). Sąsiedztwo. *Plotka Wileńska: tygodnik satyryczno-humorystyczny,* 1(25), s. 5.

Szypowska, Maria. (1971). *Asnyk znany i nieznany*. Warszawa: Państwowy Instytut Wydawniczy.

Šestov, Lev. (2007). *Dostoevskij i Nicše: filosofiâ tragedii*. Moskva: AST. [Шестов, Лев. (2007). *Достоевский и Ницше: философия трагедии*. Москва: АСТ].

Towiański, Andrzej. (1882). *Pisma*: w 3 t. T. I: *Część wstępna – część pierwsza.* Turyn: S. Falkowski i K. Baykowski.

Tretiak, Józef. (1922). *Adam Asnyk jako wyraz swojej epoki*. Kraków: Krakowska Spółka Wydawnicza.

Vanslov, Viktor. (1966). *Èstetika romantizma*. Moskva: Iskusstvo. [Ванслов, Виктор. (1966). *Эстетика романтизма*. Москва: Искусство].

Veras, Zos′ka. (2015). *Vybranyâ tvory*. Mìnsk: Belaruskaâ navuka. [Верас, Зоська. (2015). *Выбраныя творы*. Мінск: Беларуская навука].

Wieleżyńska, Julja. (1930). *Ze studjów nad Asnykiem.* Warszawa: Drukarnia Kooperatywy Prac. Druk.

Zaharova, Tat′âna. (2012). Katastrofizm kak âvlenie evropejskoj i russkojkul′tury pervoj treti XX v. *Vestnik Tambovskogo universiteta. Gumanitarnye nauki*, 1, s. 184–189. [Захарова, Татьяна. (2012). Катастрофизм как явление европейской и русской культуры первой трети XX в. *Вестник Тамбовского университета. Гуманитарные науки*, 1, с. 184–189].

Zapartyka, Ganna. (2015). *Gavoryc' z vekam Zos'ka Veras...* U: Zos′ka Veras. *Vybranyâ tvory* (s. 5–18). Mìnsk: Belaruskaâ navuka. [Запартыка, Ганна. (2015). *Гаворыць з векам Зоська Верас…* У: Зоська Верас. *Выбраныя творы* (с. 5–18). Мінск: Беларуская навука].

SUBMITTED: 14.01.2022
ACCEPTED: 10.10.2022
PUBLISHED ONLINE: 22.12.2022

## ABOUT THE AUTHOR / O AUTORZE

**Anatol Brusevich / Анатоль Брусевіч** – Białoruś, Grodno, Grodzieński Uniwersytet Państwowy im. Janki Kupały, Katedra Filologii Polskiej; dr, doc.; spec.: literaturoznawstwo; zainteresowania naukowe: poezja białoruska, poezja polska, polsko-białoruskie związki literackie.

Adres: Кафедра польскай філалогіі, Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы, 230023, вул. Ажэшкі, 22, г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Wybrane publikacje:

1. Брусевіч, Анатоль (2021). Ад Міцкевіча да Лянгэ: дыскурс мастацкага касмапалітызму. *Тэрмапілы*, 25, с. 225–243.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 26/12/2024 08:20:51



2. Брусевіч, Анатоль (2020). Беларуска-польскае літаратурнае памежжа ў эстэтычнай прасторы XIX стагоддзя. *Białorutenistyka Białostocka*, 12, s. 9–22.
3. Брусевіч, Анатоль (2014). Экзістэнцыйнае падарожжа Эдзіка Мазько. *Białorutenistyka Białostocka*, 6, s. 135–151.
4. Брусевіч, Анатоль (2011). Адам Міцкевіч у беларускім культурным каноне. *Białorutenistyka Białostocka*, 3, s. 21–32.
5. Брусевіч, Анатоль (2008). *Фактары беларускай культуры ў творчасці Адама Міцкевіча.* Гродна: ГрДУ.